**1998 год**

**Броска, Т.П. Віраваў кірмаш у Зэльве / Т.П.Броска // Праца. – 1998. – 1 ліпеня. – С.3.**

20 мая гэтага года споўнілася 280 гадоў з дня падпісання прывілея каралём Рэчы Паспалітай Аўгустам II Моцным, згодна якога ўладальнікі Зэльвы князі Сапегі атрымалі права арганізаваць "ярмонку или торги в день Святой Троицы».
З 1721 года Анненскі (у гонар храмавага свята святой Ганны) кірмаш у Зэльве адыгрывае значную ролю ва ўнутраным гандлі Гродзенскай губерніі і ў жыцці насельніцтва.

Аб Зэльвенскім кірмашы пісалі многія вучоныя і даследчыкі. Так гісторык і падарожнік І.Крашэўскі ў сваёй брашуры "Зэльвенскі кірмаш", выдадзенай у 1840-я гады пісаў: "З вельмі даўніх часоў Зэльва і яе жыхары падпарадкоўваюцца здзіўляючаму праву калі 11 месяцаў у годзе яны марнеюць а толькі месяц жывуць".

Другі сучаснік Г. Астраменцкі пісаў, што ён (кірмаш) "сапраўды ажыўляе прамысловасць да падыходу яго ўжо падрыхтоўваюцца, кожны, здаецца, чакае яго з нецярпеннем: возчыкі на працягу ўсяго месяца не выпрагаюць сваіх коней, тракты напоўнены павозкамі з Гродна ў Зэльву, адгэтуль у Вільню, Рыгу, Слонім і назад, а таксама ў Бердычаў і Дубну; таму мясцовасці Зэльвы прымаюць у гэты час выгляд шматлюднай вобласці".
У наш час аб Анненскім кірмашы пісалі даследчыкі В.Швед, І. Казлоўскі, С.Асіноўскі, з цікавымі артыкуламі якіх зэльвенцы маглі пазнаёміцца на старонках "Працы".